Такім чынам, у беларускім моўным кантынууме шырока выкарыстоўваюцца дзеясловы са значэннем атмасферных ападкаў і электрычных з'яў у атмасферы. Янывалодаюць вялізным патэнцыялам для развіцця другасных лексіка-семантычных варыянтаў і ў шматлікіх кантэкставых фрагментах адлюстроўваюцьсамыя розныя выяўленні руху.На першы план могуць вылучацца прыметы інтэнсіўнасці, сілы ўздзеяння,працягласці, хуткасці, дынамічнасці, а таксамагукавыя характарыстыкі, якія атаясамліваюццазпрацэсам маўлення чалавека, атаксамагукамі жывёл і птушак,гукамі агнястрэльнай зброі, музычнымі гукамі іінш.У некаторых выпадках метэонімы (*ісці, падаць*,*сцябаць)*уключаюцца не ў адну, а ў некалькі мікрагруп, што сведчыць пра адкрытасць мэтэаралагічнай сістэмы, яе своеасаблівуюдыфузнасць і семантычную «судакранальнасць» з іншымі намінацыямі. Зрэдку ў структурыдзеясловаў развіваецца другасная семантыка, якая адлюстроўвае асаблівасці эмацыянальнага стану чалавека, яго настрой, пачуцці,перажыванні,паводзіны (*бушаваць* ‘бурна выказваць сваю незадаволенасць, гнеў’, *грымець*‘гаварыць гучным узрушаным голасам, з гневам або запалам’). Метэаралагічная лексіка ў пэўнай ступені адлюстроўвае спецыфіку беларускай ментальнасці, а таксаманацыянальнай моўнай карціны свету.

***А. М. Сяргейчык***

*выкладчык кафедры крымінальнага працэсу*

*Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь*

## ФУНКЦЫЯНАВАННЕ КРЫМІНАЛЬНАГА ЗАКОНА Ў ЧАСЕ: ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

Для разгляду тэрміналагічнага аспекту функцыянавання крымінальнага закона ў часе звернемся да метаду логіка-семантычнага аналізу, адпраўной пасылкай якога з'яўляецца сувязь сэнсу выказванняў з умовамі іх ісціннасці, г. зн. неабходнасць адпаведнасці імя ісціннага выказвання аб'ектыўнай рэальнасці.

Для гэтага свае развагі будзем папярэджваць аналізам тэрміналогіі, якая выкарыстоўваеццаў крымінальна-прававой дактрыне і адносіцца да

функцыянавання крымінальнага закона ў часе, з пункту гледжання яе логіка-семантычнай адпаведнасці аб'ектыўнай рэальнасці.

Такі аналіз уяўляецца мэтазгодным пачаць з навуковых катэгорый *дзеянне* і *прымяненне крымінальнага закона ў часе*.

Дадзеныя катэгорыі не нясуць у сабе ўказання на часавую накіраванасць вызначаемых імі з'яў, але маюць значэнне для ўсведамлення працэсу тэмпаральнага функцыянавання крымінальнага закона.

У ч. 2 арт. 9 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей – КК) зваротная сіла крымінальнага закона вызначана як *распаўсюджванне* названага закона на асоб, якія ўчынілі злачынствы да ўваходжання такога закона ў сілу [18].

Што канкрэтна ўкладаецца заканадаўцам у паняцце *распаўсюджванне*, не зусім зразумела. У дактрыне гаворка ідзе, як правіла, або пра *дзеянне* крымінальнага закона, або пра яго *прымяненне*.

У Рэспубліцы Беларусь на сённяшні дзень няма комплекснага нарматыўна зацверджанага слоўніка юрыдычных тэрмінаў, які б сістэматызаваў паняційна-катэгарыяльны апарат функцыянавання крымінальнага закона ў часе, таму ў рамках нашага аналізу звернемся да «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы» пад рэдакцыяй М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко (далей – ТСБЛМ) і «Вялікага тлумачальнага слоўніка рускай мовы» пад рэдакцыяй С. А. Кузняцова (далей – слоўнік Кузняцова) [17; 5]. Названыя слоўнікі выдадзены адпаведна пад грыфам Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Інстытута лінгвістычных даследаванняў Расійскай акадэміі навук, а значыць маюць высокую ступень аўтарытэтнасці.

Лексічнае значэннедзеяслова *распаўсюдзіць* у ТСБЛМвызначана наступным чынам: «пашырыць сферу *дзеяння* (вылучана намі. – *А. С.*) на каго-, што-н.» [17, с. 553]. Слоўнік Кузняцова дае для дадзенага дзеяслова больш шырокае вызначэнне: «пашырыць круг *дзеяння, прымянення* (выдзелена намі – *А. С.*) чаго-н.» [5, с. 1094].

Іншымі словамі, абапіраючыся на лексічнае значэнне дзеяслова *распаўсюдзіць,* можна перадаць сэнс азначэння зваротнай сілы крымінальнага закона, дадзенага беларускім заканадаўцам, як *дзеянне* і (або) *прымяненне* названага закона ў дачыненні да асоб, якія ўчынілізлачынствы да ўваходжання такога закона ў сілу. Гэта значыць, у дадзеным выпадку мае месца фактычнае атаясамліванне беларускім заканадаўцам дзеяння і прымянення крымінальнага закона ў часавым

сэнсе. Ва ўсякім выпадку, заканадавец не ўдакладняе, чым з'яўляецца *зваротная сіла крымінальнага закона*: праявай яго *дзеяння* ці *прымянення*.

У дактрыне пытанне аб размежаванні такіх катэгорый, як *дзеянне крымінальнага закона ў часе* і *прымяненне крымінальнага закона ў часе* спецыяльна не разглядалася. Як правіла, гаворка ідзе пра размежаванне *дзеяння* і *прымянення закона* па-за тэмпаральным кантэкстам. С. С. Аляксееў, у прыватнасці, адзначае: «акт прымянення права *канкрэтызавана дапаўняе ўладнасць юрыдычных норм, гэта значыць канкрэтызавана да дадзенага выпадку ўладна падмацоўвае іх дзеянне*» [1, с. 10].Адпаведна катэгорыя *прымянення крымінальнага закона* разглядаецца зазвычай без тэмпаральнай прывязкі. Так, С. С. Аляксееў пад *прымяненнем закона* наогул разумее дзейнасць кампетэнтных праваахоўных органаў, накіраваную на вырашэнне юрыдычных спраў [2, с. 130]. Падобнае азначэнне ў дачыненні да крымінальных законаў дае і А. М. Жураўлёва [21, с. 76–77].

Адносна вызначэння катэгорыі *дзеяння крымінальнага закона ў часе* існуе некалькі пунктаў гледжання.

А. М. Жураўлёва, абагульняючы погляды, выпрацаваныя ў крымінальна-прававой дактрыне, вылучае тры падыходы да вызначэння *дзеяння крымінальнага закона ў часе*, якія разглядаюць яго як: 1) магчымасць прымянення крымінальнага закона; 2) перыяд паміж момантамі ўваходжання ў сілу крымінальнага закона і страты ім сілы; 3) працэс функцыянавання закона [21, с. 78; 10, с. 10]. Пры гэтым навуковец не разглядае дадзеныя вызначэнні ў якасці ўзаемавыключальных, лічачы іх узаемадапаўняльнымі аспектамі тэмпаральнага дзеяння крымінальнага закона [21, с. 78; 10, с. 10].

Н. Г. Урублеўская дае больш вузкае вызначэнне, пабтрымліваючы агульнапрызнаную у крымінальна-прававой навуцы пазіцыю аб тым, што «дзеянне закона ў часе пачынаецца з моманту ўваходжання закона ў сілу (увядзення ў дзеянне) і спыняецца ў момант страты ім сілы» [9, с. 11].

Як відаць з прыведзеных прыкладаў, вучоныя, хаця і размяжоўваюць паняцці *дзеяння* і *прымянення* крымінальнага закона як такія [1, с. 10; 10, с. 10 і інш.], аднак, вызначаючы катэгорыю *дзеяння крымінальнага закона ў часе*, або фактычна атаясамліваюць яе з катэгорыяй *прымянення крымінальнага закона ў часе* (А. М. Жураўлёва і інш.), або даюць вызначэнне катэгорыі дзеяння *крымінальнага закона ў часе* без суаднясення з катэгорыяй *прымянення крымінальнага закона ў часе* (Н. Г. Урублеўская і інш.).

З улікам выкладзенага ўяўляецца неабходным пры дапамозе логіка-семантычнага аналізу размежаваць катэгорыі *дзеянне крымінальнага закона ў часе* і *прымяненне крымінальнага закона ў часе*, робячы акцэнт на іх тэмпаральнай *нятоеснасці*.

На нашу думку, пад *дзеяннем крымінальнага закона ў часе* варта разумець пасіўнае з пункту гледжання праяўлення дзяржаўнай волі функцыянаванне крымінальнага закона ў дачыненні да нявызначанага кола асоб з моманту ўваходжання названага закона ў сілу да моманту страты ім сілы; пад *прымяненнем крымінальнага закона ў часе* – актыўнае з пункту гледжання праяўлення дзяржаўнай волі функцыянаванне крымінальнага закона ў дачыненні да асоб, што ўчынілі злачынства, якое пачынаецца пасля моманту ўваходжання крымінальнага закона ў сілу і заканчваецца або з яго адменай, або з уваходжаннем у сілу новага, больш спрыяльнага крымінальнага закона, або ў сувязі з заканчэннем тэрмінаў даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці або выканання пакарання, або ў сувязі са смерцю апошняй асобы, якая ўчыніла злачынства, прадугледжанае дадзеным законам, у перыяд яго дзеяння, у выпадку калі ў дачыненні да гэтай асобы тэрміны даўнасці вызвалення ад крымінальнай адказнасці і пакарання не прымяняюцца.

Разбяром дадзеныя азначэнні больш падрабязна.

Па-першае, варта падкрэсліць, што мы выкарыстоўваем у азначэннях тут і далей па тэксце прыметнікі *пасіўны* і *актыўны* для вызначэння характару функцыянавання крымінальнага закона менавіта з пункту гледжання формы праяўлення дзяржаўнай волі ў працэсе праварэалізацыі. Само прымяненне крымінальнага закона мы адносім адначасова і да форм функцыянавання крымінальнага закона (разам з дзеяннем), і да форм яго рэалізацыі (разам з прытрымліваннем, выкананнем і выкарыстаннем).

Па-другое, мы свядома вызначылі дакладныя часавыя рамкі *дзеяння* крымінальнага закона і адначасова не вызначылі іх для *прымянення*, таму што часавыя рамкі дзеяння крымінальнага закона строга вызначаюцца момантамі ўваходжання дадзенага закона ў сілу і страты ім сілы. Часавыя ж рамкі, у межах якіх магчыма прымяненне крымінальнага закона, носяць фактарны характар, г. зн. залежаць ад ступені спрыяльнасці дадзенага закона ў параўнанні з законамі, якія змяшчаюць адпаведную крымінальна-прававую норму і дзейнічаюць пасля замены імі адпаведнага закона, ад прымянення да прадугледжаных дадзеным законам дзей тэрмінаў даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці, а таксама ад наяўнасці канкрэтных фактаў учынення грамадска небяспечных дзей,

прадугледжаных названымі крымінальнымі законамі, якія ўступаюць у калізію паміж сабой.

*Дзеянне* і *прымяненне крымінальнага закона ў часе* мы вызначылі праз родавае паняцце *функцыянаванне крымінальнага закона ў часе*, кіруючыся пры гэтым наступнымі меркаваннямі.

Паводле ТСБЛМ, *функцыянаваць* азначае «дзейнічаць, быць у рабоце, працаваць» [17, с. 715]. Дзеяслоў жа *працаваць* азначае «ажыццяўляць якую-н. дзейнасць» [17, с. 504]. Іншымі, словамі, з пункту гледжання лексічнага значэння, назоўнікі *функцыянаванне* і *дзеянне,* безумоўна, цесна звязаны, аднак, абапіраючыся выключна на лексічнае значэнне, цяжка дакладна вызначыць, які з двух назоўнікаў па сэнсе ахоплівае іншы, г. зн. якое з двух паняццяў з'яўляецца родавым, а якое відавым. Для гэтага неабходна суаднесці лексічнае і спецыяльна-юрыдычнае значэнне названых паняццяў. Функцыянаванне права ў спецыяльна-юрыдычным сэнсе (або па ўнутраным крытэрыі) выяўляецца ў яго рэгулятыўнай і ахоўнай функцыях (часам ахоўную функцыю разглядаюць у якасці аднаго з відаў рэгулятыўнай [7, с. 151 і інш.]). У сваю чаргу рэгулятыўная функцыя ажыццяўляецца ў форме замацавання ў нарматыўных прававых актах грамадска карысных адносін, якія патрабуюць стабільнасці (рэгулятыўна-статычная функцыя), або нарматыўнага афармлення дынамікі грамадскіх адносін (рэгулятыўна-дынамічная функцыя) [7, с. 150–151; 8, с. 101–102; 20, с. 219–220 і інш.], г. зн. шляхам увядзення ў дзеянне адпаведных нарматыўных прававых актаў. Іншымі словамі, функцыянаванне права праз ажыццяўленне дзяржавай рэгулятыўна-статычнай і рэгулятыўна-дынамічнай функцый праяўляецца ў форме *дзеяння* закона. Ахоўная ж функцыя (або рэгулятыўна-ахоўная) накіравана на забеспячэнне ажыццяўлення рэгулятыўнай-статычнай і рэгулятыўнай-дынамічнай функцый права, на абарону права ад парушэнняў і ажыццяўляецца ў форме інфармавання ўдзельнікаў грамадскіх адносін аб тым, якія сацыяльныя каштоўнасці заканадаўча абаронены дзяржавай, якія дзеі забаронены (дзеючым законам), а таксама ў форме ўздзеяння на правапарушальнікаў, якая рэалізуецца шляхам *прымянення* закона [7, с. 150–152; 8, с. 102; 20, с. 220 і інш.]. Адпаведна, функцыянаванне права з дапамогай ажыццяўлення дзяржавай ахоўнай (рэгулятыўна-ахоўнай) функцыі праяўляецца ў форме *дзеяння* і *прымянення* закона. Такім чынам, *функцыянаванне права* (а таксама *функцыянаванне закона* як яго знешняга фармальнага выражэння), з пункту гледжання рэалізацыі дзяржаўнай волі, выяўляецца ў

форме *дзеяння* і *прымяненнязакона*. Таму з улікам лексічнага і спецыяльна-юрыдычнага (якое не супярэчыць лексічнаму, а ўдакладняе яго) значэнняў паняццяў *функцыянаванне закона* і *дзеянне закона* апошняе неабходна прызнаць больш вузкім у параўнанні з першым. Адпаведна, *функцыянаванне крымінальнага закона* можна вызначыць як здольнасць крымінальнага закона ўплываць на паводзіны грамадзян і рэгуляваць іх, якая праяўляецца ў форме дзеяння крымінальнага закона і прымянення крымінальнага закона, ці ў часавым кантэксце – як здольнасць крымінальнага закона ўплываць на паводзіны грамадзян і рэгуляваць іх напрацягу вызначанага законам перыяду, якая праяўляецца ў форме дзеяння крымінальнага закона ў часе і прымянення крымінальнага закона ў часе.

Паняцце *функцыянаванне крымінальнага закона* не новае. Яно перыядычна выкарыстоўваецца ў крымінальна-прававой дактрыне [15, с. 69, 75 і інш.], аднак, пры аналізе тэрміналогіі, якая выкарыстоўваецца ў навуковай літаратуры пры разглядзе інстытута функцыянавання крымінальнага закона ў часе, міжволі ўзнікае пытанне: навошта паняцці *тэмпаральнага дзеяння* і *прымянення* вызначаць праз паняцце *функцыянаванне ў часе*, калі часавыя рамкі магчымага *прымянення* крымінальнага закона цалкам ахопліваюцца часавымі рамкамі яго дзеяння, г. зн. у тэмпаральным сэнсе паняццем *дзеяння* крымінальнага закона ахопліваецца і паняцце яго *прымянення*, бо і ў літаратуры можна прачытаць: дзейнічае са зваротнай сілай [9, с. 26; 11, с. 21; 16, с. 6] і прымяняецца са зваротнай сілай [3, с. 56], дзейнічае ўльтраактыўна [3, с. 56; 9, с. 36, 38; 12, с. 23] і прымяняецца ўльтраактыўна [9, с. 38] і г. д.

Так, паняццем *дзеяння крымінальнага закона ў часе* фактычна ахопліваюць паняцце яго *прымянення ў часе*, напрыклад, А. І. Байцоў і Б. У. Валжэнкін, вылучаючы тры прынцыпы такога дзеяння: «1) прымяненне да дзеі закона, які адпавядае часу яе ўчынення; 2) абарачальнасць больш мяккага і 3) неабарачальнасць больш строгага закона» [4, с. 4]. У гэтым жа ключы разважаў і Я. М. Брайнін, адзначаючы, што «неабходным атрыбутам дзеючага крымінальнага закона з’яўляецца не толькі наяўнасць у яго юрыдычнай сілы, але і магчымасць прымянення ў пэўным выпадку для вырашэння канкрэтнай крымінальнай справы» [6, с. 130].

*Дзеянне* і *прымяненне* крымінальнага закона ў тэмпаральным сэнсе фактычна атаясамлівае і М. Р. Мельнікаў, сцвярджаючы, што кожны дзеючы крымінальны закон мае свой пэўны аб’ём, сутнасць якога

раскрываецца ў вучэнні аб межах яго дзеяння і канкрэтызуецца ў вызначэнні аднесенасці пэўнага акта чалавечых паводзін да той ці іншай заканадаўчай пастановы. Зыходзячы з гэтага,навуковец разумее пад дзеяннем крымінальнага закона ў часе пэўную сувязь паміж аб’ёмам закона і актам паводзін суб’екта прававых адносін [12, с. 12]. Сапраўды, канкрэтызацыя аб’ёму закона праз вызначэнне аднесенасці пэўнага акта чалавечых паводзін да той ці іншай заканадаўчай пастановы з’яўляецца нічым іншым, як *прымяненнем* крымінальнага закона.

Больш за тое, беларускі заканадавец, даўшы арт. 9 КК назву «Дзеянне крымінальнага закона ў часе» [18], фактычна ахапіў у тэмпаральным сэнсе паняццем *дзеяння* крымінальнага закона паняцце яго *прымянення*, таму што гаворка ў дадзеным артыкуле відавочна ідзе як пра *дзеянне*, так і пра *прымяненне* крымінальнага закона ў часе.

З нашага пункту гледжання, *дзеянне крымінальнага закона ў часе* ахоплівае ў тэмпаральным сэнсе яго *прымяненне*, толькі ў тым выпадку, калі гэты закон менш спрыяльны ў параўнанні з папярэднім і наступным крымінальнымі законамі, у адваротным жа выпадку часавыя межы іх дзеяння і прымянення адрозніваюцца або па колу асоб (у выпадку, калі крымінальны закон больш спрыяльны ў параўнанні з папярэднім, але менш спрыяльны ў параўнанні з наступным крымінальнымі законамі), або тэмпаральныя межы магчымага прымянення крымінальнага закона выходзяць за рамкі тэмпаральных межаў яго дзеяння (у выпадку, калі крымінальны закон больш спрыяльны ў параўнанні з наступным, але менш спрыяльны ў параўнанні з папярэднім), або адрозніваюцца па коле асоб пры адначасовым выхадзе межаў прымянення адпаведнага крымінальнага закона за часавыя рамкі яго дзеяння (у выпадку, калі крымінальны закон больш спрыяльны ў параўнанні як з папярэднім, так і з наступным крымінальнымі законамі).

Растлумачым сваю пазіцыю, прымяніўшы метад доказу ад адваротнага.

Дапусцім, што *дзеянне* і *прымяненне* крымінальнага закона ў тэмпаральным сэнсе тоесныя. Тады, напрыклад, прымяняючы крымінальны закон ультраактыўна, мы павінны ўяўляць яго дзеючым і пасля страты ім сілы, якая можа адбыцца ў дадзеным выпадку шляхам замены названага закона новым менш спрыяльным крымінальным законам, які змяшчае адпаведную крымінальна-прававую норму. Іншымі словамі, у момант ультраактыўнага прымянення «старога» крымінальнага закона адначасова дзейнічаюць і «стары», і «новы» закон. Здавалася б, гэту

супярэчнасць можна выразіць указаннем на тое, што «стары» закон захоўвае сваё дзеянне толькі ў дачыненні да злачынных дзей, учыненых падчас яго дзеяння. Аднак ён жа быў *адменены*, г. зн. страціў сілу (чытай: спыніў дзеянне, стаў нядзеючым).

Пры дадзеным разуменні і словаўжыванні, мы непазбежна прыходзім да логіка-семантычнага парадоксу: у выпадку ўльтраактыўнага прымянення *дзейнічае нядзеючы* закон.

Аб няслушнасці тэмпаральнага атаясамлівання паняццяў *дзеянне* і *прымяненне* крымінальнага закона сведчаць і дыскусійныя тэзісы ў працах вучоных.

Так, А. В. Навумаў сцвярджае, што «крымінальны закон, які ўвайшоў у сілу, *дзейнічае да яго адмены або замены новым законам*(вылучана намі. – *А. С.*). З гэтага моманту стары крымінальны закон лічыцца пазбаўленым сілы і *прымяненню не падлягае* (вылучана намі. – *А. С.*)» [13, с. 98]. Узнікае пытанне, як быць з *ультраактыўнасцю* крымінальнага закона. Зыходзячы з дадзенага навукоўцамвызначэння, закон часу ўчынення злачынства не можа быць *прыменены*, калі, напрыклад, да моманту разгляду справы ў судзе ён быў заменены новым законам, г. зн. спыніў сваё *дзеянне*.

Крыху інакш атаясамліваюць разглядаемыя паняцці М. І. Блум і А. А. Ціле. У сваёй працы «Зваротная сіла закона. Дзеянне савецкага крымінальнага закона ў часе» на с. 56, ведучы гаворку аб ультраактыўным прымяненні крымінальнага закона, вучоныя адзначаюць, што «ён па волі заканадаўца *дзейнічае* (вылучана намі. – *А. С.*) звыш адведзенага яму часу». Аднак, далей на той жа старонцы адзначаюць: «Так, калі 1 студзеня 1969 г. новы закон замяніў больш строгі закон, *які дзейнічаў* (вылучана намі. – *А. С.*) у момант учынення злачынства (напрыклад, 10 снежня 1968 года), то падчас вынясення прыгавору ў студзені 1969 г. суд прымяняе *не дзеючы* (вылучана намі. – *А. С.*) закон, а закон стары, закон *нядзеючы* (вылучана намі. – *А. С.*), закон *адменены* (вылучана намі. – *А. С.*)» [3].

Іншымі словамі, у М. І. Блум і А. А. Ціле, з аднаго боку, «звыш адведзенага яму часу» *дзейнічае нядзеючы* закон, а, з другога, – ён жа *прымяняецца*, хаця і з’яўляецца нядзеючым, г. зн. мае месца логіка-семантычная супярэчнасць.

Іншы прыклад. А. М. Папоў да прынцыпаў *дзеяння* крымінальнага закона ў часе адносіць наступныя палажэнні: злачыннасць і каральнасць дзеі вызначаецца законам, які дзейнічаў падчас учынення гэтай дзеі; больш

строгі закон зваротнай сілы не мае; больш мяккі закон мае зваротную сілу [14, с. 23]. Пры гэтым навуковец адзначае, што «палажэнне аб тым, што больш строгі закон зваротнай сілы не мае, *практычна азначае* (вылучана намі. – *А. С.*), што *прымяненню* (вылучана намі. – *А. С.*) падлягае адменены закон, у перыяд дзеяння якога было ўчынена злачынства. Таму ў дадзеных выпадках кажуць пра *перажыванне* (*ультраактыўнасць*) (вылучана намі. – *А. С.*) старога закона» [14, с. 23]. Іншымі словамі, А. М. Папоў да прынцыпаў *дзеяння* крымінальнага закона ў часе адносіць ультраактыўнае прымяненне крымінальнага закона («адменены закон, у перыяд дзеяння якога было ўчынена злачынства»). Або больш канкрэтна – адным з прынцыпаў *дзеяння* крымінальнага закона, паводле А. М. Папова, з'яўляецца яго *прымяненне*, калі ён *не дзейнічае*. Інакш кажучы, у А. М. Папова, нягледзячы на імкненне вучонага з дапамогай больш асцярожных фармулёвак гэтага пазбегнуць, як і ў выпадку з М. І. Блум і А. А. Ціле, *дзейнічае нядзеючы закон*.

Спрабуючы прымірыць супярэчнасці, якія ўзнікаюць у сувязі з тэмпаральным атаясамліваннем паняццяў *дзеянне* і *прымяненне* крымінальнага закона, Н. Г. Урублеўская прапануе адрозніваць паняцці *дзеючы закон* і *час дзеяння крымінальнага закона*. Пры гэтым пад *дзеючым законам* прапануецца разумець закон, які дзейнічае ў цяперашні час, г. зн. які ўвайшоў у сілу і не страціў яе. Паняцце ж *час дзеяння крымінальнага закона*, на думку Н. Г. Урублеўскай, павінна ўключаць у сябе і перыяд прымянення норм закона, які страціў сілу (ультраактыўнае дзеянне). Далей аўтар, абагульняючы сказанае, прапаноўвае лічыць часам дзеяння крымінальнага закона «перыяд, які пачынаецца з моманту ўваходжання закона ў сілу і заканчваецца 1) у момант уваходжання ў сілу больш мяккага закона, які яго замяняе, або 2) у момант, калі спынены ўсе крымінальна-прававыя адносіны, якія ўзніклі ў сувязі з учыненнем грамадска небяспечных дзей, забароненых гэтым крымінальным законам, г. зн. адсутнічаюць падставы для яго прымянення» [9, с. 38].

Дадзеная пазіцыя ўяўляецца не ў поўнай меры слушнай па шэрагу прычын. Па-першае, навуковец прапануе адрозніваць у тэмпаральным сэнсепаняцці *дзеючы крымінальны закон* і *час дзеяння крымінальнага закона*. Пры гэтым, паводле Н. Г. Урублеўскай, *час дзеяння крымінальнага закона* ўключае ў сябе перыяд, калі прымяняецца крымінальны закон, *які страціў сілу,* г. зн.*нядзеючы* (у выпадку ўльтраактыўнага прымянення). Іншымі словамі, у *час дзеяння крымінальнага закона* можа *дзейнічаць нядзеючы закон*. Больш за тое, з пункту гледжання логіка-семантычных

сувязяў паняцці *дзеючы крымінальны закон* і *час дзеяння крымінальнага закона* ў тэмпаральным сэнсе відавочна тоесныя. Сапраўды, закон з'яўляецца *дзеючым* у час свайго *дзеяння,* г. зн. закон не можа стаць *нядзеючым*, хаця *час яго дзеяння* не скончыўся.

Такім чынам, як справядліва адзначае М. В. Феактыстаў, «з моманту адмены закон *перастае дзейнічаць* (вылучана намі. – *А. С.*), ён *страчвае* сваю *юрыдычную сілу* (вылучана намі. – *А. С.*) <...> Мы *прымяняем* (вылучана намі. –*А. С.*) гэты закон толькі да тых адносін, якія мелі месца ў перыяд яго дзеяння» [19, с. 133].

Іншымі словамі, катэгорыі *дзеянне крымінальнага закона ў часе* і *прымяненне крымінальнага закона ў часе* ў тэмпаральным сэнсе нятоесныя. Катэгорыі *дзеянне крымінальнага закона ў часе* і *прымяненне крымінальнага закона ў часе* ахопліваюцца катэгорыяй *функцыянавання крымінальнага закона ў часе*.

Дадзеныя катэгорыі могуць быць вызначаны наступным чынам:

- *функцыянаванне крымінальнага закона ў часе* – гэта здольнасць крымінальнага закона ўплываць на паводзіны грамадзян і рэгуляваць іх напрацягу вызначанага законам перыяду, якая праяўляецца ў форме дзеяння крымінальнага закона ў часе і прымянення крымінальнага закона ў часе;
- *дзеянне крымінальнага закона ў часе* – гэта пасіўнае з пункту гледжання праяўлення дзяржаўнай волі функцыянаванне крымінальнага закона ў дачыненні да нявызначанага кола асоб з моманту ўваходжання названага закона ў сілу да моманту страты ім сілы;
- *прымяненне крымінальнага закона ў часе* – гэта актыўнае з пункту гледжання праяўлення дзяржаўнай волі функцыянаванне крымінальнага закона ў дачыненні да асоб, што ўчынілі злачынства, якое пачынаецца пасля моманту ўваходжання крымінальнага закона ў сілу і заканчаецца або з яго адменай, або з уваходжаннем у сілу новага, больш спрыяльнага крымінальнага закона, або ў сувязі з заканчэннем тэрмінаў даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці або выканання пакарання, або ў сувязі са смерцю апошняй асобы, якая ўчыніла злачынства, прадугледжанае дадзеным законам, у перыяд яго дзеяння, у выпадку, калі ў дачыненні да гэтай асобы тэрміны даўнасці вызвалення ад крымінальнай адказнасці і пакарання не прымяняюцца.

## Літаратура

1. Алексеев, С. С. Общая теория социалистического права : курс лекций : в 4 вып. / С. С. Алексеев. – Свердловск : Свердлов. юрид. ин-т, 1966. – Вып. 4 : Применение права. Наука права. – 204 с.

2. Алексеев, С. С. Теория права / С. С. Алексеев. – Харьков : БЕК, 1994. – 223 с.

3. Блум, М. И. Обратная сила закона. Действие советского уголовного закона во времени / М. И. Блум, А. А. Тилле. – М. : Юрид. лит., 1969. – 136 с.

4. Бойцов, А. И. Уголовный закон : действие во времени и пространстве : учеб. пособие / А. И. Бойцов, Б. В. Волженкин. – СПб., 1993. – 104 с.

5. Большой толковый словарь русского языка / редкол. : С. А. Кузнецов (сост. и гл. ред.) [и др.]. – СПб. : Норинт, 2000. – 1536 с.

6. Брайнин, Я. М. Уголовный закон и его применение / Я. М. Брайнин. – М. : Юрид. лит., 1967. – 240 с.

7. Вишневский, А. Ф. Общая теория государства и права : учебник / А. Ф. Вишневский, Н. А. Горбаток, В. А. Кучинский ; под ред. В. А. Кучинского. – 2-е изд. – Минск : Акад. МВД, 2014. – 480 с.

8. Волинка, К. Г. Теорія держави і права : навч. посібник / К. Г. Волинка. – К. : МАУП, 2003. – 240 с.

9. Врублевская, Н. Г. Обратная сила норм уголовного закона : теоретические и прикладные проблемы : дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.08 / Н. Г. Врублевская. – Минск, 2005. – 125 л.

10. Журавлева, Е. М. Действие уголовного законодательства Российской Федерации во времени : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.08 / Е. М. Журавлева ; Акад. управл. МВД России. – М., 1997. – 26 с.

11. Медведев, А. М. Пределы действия Уголовного кодекса Российской Федерации : практ. пособие / А. М. Медведев ; под ред. В. П. Кашепова. – М. : Юрид. лит., 1998. – 144 с.

12. Мельников, М. Г. Действие уголовного закона во времени и пространстве : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.08 / М. Г. Мельников ; Рязан. ин-т права и экономики МВД России. – Рязань, 1999. – 27 с.

13. Наумов, А. В. Российское уголовное право. Общая часть : курс лекций / А. В. Наумов. – М. : БЕК, 1996. – 550 с.

14. Попов, А. Н. Уголовный закон и его обратная сила / А. Н. Попов. – СПб., 1998. – 48 с.

15. Савенок, А. Л. Теория эффективности уголовного закона / А. Л. Савенок. – Минск : Акад. МВД, 2017. – 260 с.

16. Тилле, А. А. Время, пространство, закон. Действие советского закона во времени и пространстве / А. А. Тилле. – М. : Юрид. лит., 1965. – 203 с.

17. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – 3-е выд. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2002. – 784 с.

18. Уголовный кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс] : 9 июля 1999 г., № 275-З : принят Палатой представителей 2 июня 1999 г. : одобр. Советом Респ. 24 июня 1999 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 18.07.2017 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2018.

19. Феоктистов, М. В. Обратная сила уголовно-правовых норм : законодательные загадки / М. В. Феоктистов // Уголовное право. – 2012. – № 5. – С. 124–133.

20. Хропанюк, В. Н. Теория государства и права : учеб. пособие для высш. учеб. заведен. / В. Н. Хропанюк : под ред. В. Г. Стрекозова. – 2-е изд., доп., испр. – М. : Интерстиль, 2000. – 384 с.

21. Энциклопедия уголовного права : в 35 т. / редкол. : В. Б. Малинин (отв. ред.) [и др.]. – СПб. : Издание профессора Малинина, 2005–2015. – Т. 2 : Уголовный закон. – 2005. – 848 с.

***К. Л. Хазанава***

*кандыдат філалагічных навук,*

*дацэнт кафедры беларускай мовы*

*Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны*

## РЭЛІГІЙНАЯ ЛЕКСІКА Ў БЕЛАРУСКІХ НАРОДНА-ПАЭТЫЧНЫХ ТЭКСТАХ

Мова беларускай народнай паэтычнай творчасці ў цэлым і абрадавай паэзіі ў прыватнасці адрозніваецца выразнасцю вершаванага слова і вобразнасцю адлюстравання аб’ектыўнай рэчаіснасці. Беларускія фальклорныя песенныя тэксты характарызуецца адметным слоўнікам з багатым і разнастайным лексіка-тэматычным напаўненнем, што намі адзначалася пры лінгвістычным аглядзе каляндарна-абрадавых песень Гомельшчыны [7].